Установа адукацыі

“Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”

Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый

Кафедра інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый

| | |
|---|---|
| УЗГОДНЕНА | УЗГОДНЕНА |
| Загадчык кафедры | Дэкан факультэта |
| ______________Ж. Л. Раманава | ______________Ю. М. Галкоўская |
| «___»______________ 2022 г. | «___»______________ 2022 г. |

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС

ПА КУРСУ ПА ВЫБАРУ

# ГІСТОРЫЯ І МЕТАДАЛОГІЯ НАВУКОВЫХ ВЕДАЎ

для студэнтаў спецыяльнасці

1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках)

Складальнік:

Л.У.Ландзіна, доктар гістарычных навук, дацэнт, прафесар кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый

Разгледжаны і зацверджаны

на паседжанні Савета ўніверсітэта 25.10.2022

пратакол № 2

**ЗМЕСТ**

1. Уводзіны. С.3–5
Тэматычны план С.6–7

2. Тэарэтычны раздзел
– вучэбныя выданні С.8
– план-каспект лекцый С.10–16
–іншыя матэрыялы (навуковая літаратура) С. 17–18

3. Практычны раздзел
– матэрыялы для правядзення семінарскіх, практычных і інш. заняткаў С. 19–24

4. Раздзел кантроля ведаў:
– пералік пытанняў для заліку С. 25–26

# 1. УВОДЗІНЫ

Курс па выбару “Гісторыя і метадалогія навуковых ведаў” прадугледжвае разгляд развіцця навукі як асобнай формы грамадскай свядомасці ад старажытнасці да нашых дзен у цывілізацыйным кантэксце. У адпаведнасці з прынцыпам гістарызму і гісторыка-генетычным метадам матэрыял выкладаецца ў храналагічнай паслядоўнасці, разглядаюцца сацыяльна-эканамічныя, палітычныя, культурныя аспекты развіцця навукі на розных этапах гістарычнага развіцця. Асобна аналізуюцца праблемы, якія мелі агульнагістарычнае значэнне ці былі вызначальнымі тэндэнцыямі. Значная ўвага нададзена актуальным антрапалагічнаму і культуралагічнаму падыходам, а таксама гісторыі паўсядзеннасці, што на практыцы ўвасабляецца ў змяненнях матэрыяльнай і духоўнай культуры і фарміруе паўсядзеннасць існавання чалавека.

*Мэта* курса па выбару “Гісторыя і метадалогія навуковых ведаў” – фарміраванне і паглыбленне светапогляду студэнтаў шляхам стварэння цэласнай карціны развіцця навукі і навукова-тэхнічных ведаў ў сусветным цывілізацыйным і сацыякультурным кантэксце.

Адпаведна, *задачамі* курсу па выбару з’яўляюцца:

- дэманстрацыя і аналіз развіцця навукі як формы грамадскай свядомасці, абумоўленай гістарычна дэтэрмінаванмі сацыякультурнымі фактарамі;
- атрыманне студэнтамі ведаў па гісторыі і метадалогіі навукі, развіццю навуковых школ і змене навуковых парадыгм;
- засваенне студэнтамі тэрміналогіі, ўласцівай для навукі і навукова-даследчай працы, а таксама разуменне прынцыпаў, прыемаў і метадаў навуковага даследавання ў іх практычным прымяненні;
- разуменне студэнтамі прычын і праяў сучаснага стану інфармацыйнага грамадства, неадназначнасці і рызыкаў рэалій тэхнагеннай цывілізацыі;
- фарміраванне культуры адносін, камунікацыі і спажывання, неабходных у сучасных умовах;

- вылучэнне сюжэтаў аб развіцці айчыннай навукі ў кантэксце агульнасусветнага і агульнаеўрапейскага развіцця;
- актывізацыя пазнавальнай дзейнасці, крэатыўнасці, гнуткасці мыслення праз вырашэнне творчых і праблемных задач.

Разгляд і засваенне курса па выбару "Гісторыя і метадалогія навуковых ведаў" прадугледжвае шчыльную сувязь разглядаемага матэрыяла з праблематыкай сусветнай гісторыі, гісторыі філасофіі, культуралогіяй, асновамі сучаснага прыродазнаўства і іншымі дысцыплінамі сацыяльна-гуманітарнага блоку ведаў, што рэалізуецца праз міжпрадметныя і міжкурсавыя сувязі.

У выніку вывучэння курса па выбару студэнт *павінен ведаць:*

– прынцыпы перыядызацыі і змест перыядаў развіцця навукі;
– крытэрыі вылучэння навукі як сацыяльнага інстытута;
– спецыфіку навуковага пазнання і адрозненне навуковай свядомасці ад штодзеннага, рэлігійнага, мастацкага, філасофскага адлюстравання свету;
– неадназначнасць характарыстык навуковсці, адноснасці, канкрэтнасці і супярэчлівасці навуковых ведаў.

Студэнт таксама *павінен умець:*

– выкарыстоўваць асноўныя і дадатковыя літаратуру і крыніцы;
– выяўляць сувязі вывучаемага матэрыялу з ведамі па культуралогіі, філасофіі, асновам сучаснага прыродазнаўства, гісторыі матэрыяльнай і духоўнай культуры і г.д. і г.д.
– чытаць, разумець і выкарыстоўваць інфармацыю карт, дыяграм, схем, табліц і іншага ілюстрацыйнага матэрыяла;
– уключаць развіццё айчыннай навукі ў агульнагістарычны кантэкст;
– супастаўляць і ацэньваць розныя пункты гледжання ў навуцы.

Рэалізацыя адзначаных задач прадуглеждвае пастаяннае ўдасканальванне і апрацоўку матэрыяла, а таксама ўлік спецыфікі канкрэтнай аўдыторыі. Таму выкладчык можа (у межах адведзеных гадзін) ацэнтаваць увагу на тых ці іншых раздзелах і пытаннях, захоўваючы змест і агульныя прапорцыі

матэрыялу выкладаемага курса. Спіс літаратуры носіць не імператыўны, а рэкамендацыйны характар. Гэта дае магчымасць для студэнта самастойнага пошуку і пашырэння кола крыніц, якія могуць уключаць, у тым ліку, электронныя і інтэрнэт-рэсурсы.

Згодна з вучэбным планам, курс “Гісторыя і метадалогія навуковых ведаў” уключае 12 гадзін лекцый, 16 гадзін практычных і семінарскіх заняткаў (7 практычных і 1 семінар) У канцы семестра – залік.

## ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | лекц. | практ. /сем. | СРС. |
| Уводзіны. Асноўныя паняцці курса | 2 | | |
| 1. Перадгісторыя навукі. Міфалагічныя, даксаграфічныя, рэцэптурныя веды Старажытнага свету і Сярэднявечча | 2 | | |
| 2. Адлюстраванне гістарычнага працэсу ў творах антычных аўтараў (кампаратыўны аналіз твораў Плутарха і Светонія) | | 2 | |
| 3. Заходняя Еўропа і славянскі свет у адлюстраванні сярэднявечных помнікаў права (кампаратыўны аналіз “Салічаскай праўды” і “Рускай праўды”) | | 2 | |
| 4. Метад, метадалогія і спецыфіка класічнай навукі | 2 | | |
| 5. Развіццё гістарычных ведаў у ранні Новы час (на прыкладзе “Хронікі…” М. Стрыйкоўскага і “Хронікі Быхаўца” | | 2 | |
| 6. Навуковыя і сацыякультурныя дэтэрмінанты неакласічнай навукі | 2 | | |
| 7. Змест, метадалогія і пабудова гістарычных прац у XIX ст. (параўнаўчы аналіз прац В. Ключэўскага і І. Лапо) | | 2 | |
| 8. Некласічная навука і прамысловая рэвалюцыя другой паловы XIX – першай паловы XX ст. | 2 | | |
| 9. Беларуская гістарычная думка першай паловы XX ст. (параўнаўчы аналіз твораў У. Ігнатоўскага і У Пічэты) | | 2 | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 10. Метадалагічныя акцэнты гістарычнай навукі сярэдзіны XX ст. (кампаратыўны аналіз прац Ф. Брадэля і Б. Грэкава) | | 2 | |
| 11. Постнекласічная навука і сучаснае інфармацыйнае грамадства | 2 | | |
| 12. Разнастайнасць падыходаў ў гуманітарных даследаваннях у постсавецкі час (параўнаўчы аналіз твораў Ж. ле Гофа і М. Ермаловіча) | | 2 | |
| 13. Сучасныя навуковыя распрацоўкі і прагнозы будучага | | 2 | |
| Усяго | 12 | 16 | |

## 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ
## ВУЧЭБНЫЯ ВЫДАННІ


1. Гутова, С. Г. Основные вопросы теории и методологии научного познания : учебное пособие / С. Г. Гутова, Н. Н. Самохина. — Нижневартовск : НВГУ, 2020. — 113 с. — ISBN 978-5-00047-570-6. — Режим доступа: https://e.lanbook.com/book/208148
2. История философии : учебное пособие для студентов учреждений высшего образования по гуманитарным специальностям. В 2 ч. Ч. 1 / А. А. Бородич [и др.] ; под ред. Ч. С. Кирвеля. - Минск : Вышэйшая школа, 2021. - 360 с. : рис. - ISBN 978-985-06-3360-6 (ч. 1) : 47-06.
3. История философии : учебное пособие для студентов учреждений высшего образования по гуманитарным специальностям. В 2 ч. Ч. 2 / А. А. Бородич [и др.] ; под ред. Ч. С. Кирвеля. - Минск : Вышэйшая школа, 2021. - 443, [1] с. : рис. - ISBN 978-985-06-3361-3 (ч. 2) : 60-07.
4. Источниковедение : учебник для студентов высших учебных заведений, обучающихся по гуманитарным направлениям и специальностям / под ред. А. В. Сиренова. - Москва : Юрайт, 2021. - 395, [1] с. : табл. ; 25x16 см
5. Моисеева, И. Ю. История и методология науки : учебное пособие : в 2 частях / И. Ю. Моисеева ; Оренбургский государственный университет. – Оренбург : Оренбургский государственный университет, 2017. – Часть 2. – 160 с. – Режим доступа:: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=481796
6. Никитина, Е. А. Философия науки (основные проблемы) : учебное пособие / Е. А. Никитина. — 4-е изд., испр. и доп. — Москва : РТУ МИРЭА, 2022. — 117 с. - Режим доступа https://e.lanbook.com/book/265862
7. Савелова, Е. В. История и философия науки : учебное пособие / Е. В. Савелова. — Хабаровск : ХГИК, 2021. — 139 с. — Режим доступа: https://e.lanbook.com/book/204476

8. Тулинов, В. Ф. Концепции современного естествознания : учебник / В. Ф. Тулинов, К. В. Тулинов. – 3-е изд. – Москва : Дашков и К°, 2018. – 483 с. : ил. – Режим доступа: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=573158
9. Философия : учебное пособие для студентов учреждений высшего образования / А. И. Зеленков [и др.]. - Минск : РИВШ, 2020. - 351 с. : табл. ; 21x15 см. - Библиогр.: с. 309-318, библиогр. в подстроч. примеч.
10. Ясницкий, Л. Н. Современные проблемы науки : учебное пособие / Л. Н. Ясницкий, Т. В. Данилевич. – 5-е изд. (эл.). – Москва : Лаборатория знаний, 2021. – 297 с. – Режим доступа:: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=602084
11. Жарский, Н.М., Козляков, В.Е. История науки и техники с древнейших времен до 70-х гг. XIX в./ И.М. Жарский, В.Е. Козляков, Учеб. пособие. – Минск: БГТУ, 2004. – 151 с.
12. Лепешко, Б.М. Методология и логика истории / Б.М. Лепешко. – Брест: Альтернатива, 2007. – 192 с.
13. Методология истории*:* Учеб. пособие для студентов вузов / А.Н. Нечухрин, В.Н. Сидорцов, О.М. Шутова и др. – Мн.: НТООО «ТетраСистемс», 1996. – 240 с.
14. Поликарпов, В.С. История науки и техники / В.С. Поликарпов. – Уч. Пособие. – Ростов-на-Дону: Изд-во “Феникс”, 1998. – 352 с.
15. Пузырев, П.М. Краткая история науки и техники: Учебное пособие/ Н.М. Пузырев. – Тверь: ТГТУ, 2001. – 204 с.
16. Соломатин, В.А. История науки. Учебное пособие / В.А. Соломатин. – М.; ПЕРСЭ, 2003. – 352 с.
17. Шухардин, С.В. История науки и техники Ч.1. С древнейших времен до конца XVIII в./ Учебное пособие; под ред. А.А. Кузина / С.В. Шухардин. – М.; Моск. гос. ист.-арх. ин-т., 1974. – 151 с.

# ПЛАН-КАНСПЕКТ ЛЕКЦЫЙ КУРСА ПА ВЫБАРУ “ГІСТОРЫЯ І МЕТАДАЛОГІЯ НАВУКОВАГА ПАЗНАННЯ”

## Уводзіны

Навука як форма грамадскай свядомасці. Падыходы да вызначэня навукі. Адрозненні навукі ад іншых форм адлюстраваня і ператварэння рэчаіснасці. Перыядызацыя развіцця навукі. Перадгісторыя навукі: архаіка-міфалагічныя, даксаграфічныя, рэцэптурныя веды. Ператварэнне навукі ў сацыяльны інстытут. Класічная, неакласічная, некласічная і постнекласічная навука.

Галіновы падзел навук, яго афармленне і ўмоўны, рэдукцыяніскі характер. Міждысцыплінарнасць. Гісторыя як навука. Спецыфіка гістарычнай навукі. Штодзеннае і навуковае гістарычнае пазнанне. Аб’ект, прадмет і суб’ект гістарычнага пазнання. Актуальнасць і кан’юнктурнасць гістарычнах даследаванняў.

Паняційны і тэрміналагічны апарат яе неабходныя характарыстыкі навукі. Метадалогія, метад, навуковая парадыгма. Агульнананвуковыя і спецыяльныя метады навуковага даследавання. Прынцыпы і метады навуковага пазнання, іх спецыфіка ў розных навуках і гістарычная абумоўленасць. Колькасныя, сацыяльна-псіхалагічныя, герменеўтычныя метады. Інфармацыйна-энтрапійны метад. Семіятычныя, лінгвістычныя, сацыялагічныя, паліталагічныя, мастацтвазнаўчыя, эканамічныя і інш. метады.

Эмпірычныя і тэарэтычныя веды. Этапы навуковага даследавання. Гіпотэза, збор фактаў, пабудова мадэлі, інтэрпрэтацыя. Навуковая тэорыя. Даследаванне крыніц. Інтэрпрэтацыя фактаў.

Навуковы факт і яго характэрыстыкі. Філасофскія аспекты навуковага факта. Інтэрпрэтацыя навуковага факта. Спецыфіка гістарычнага факта. Сацыяльная прырода гістарычнага факта, суадносіны факта і крыніцы, двайная суб’ектывізацыя гістарычнай рэканструкцыі. Навуковы прагноз і яго абгрунтаванне. Узроўні навуковага прагноза. Сацыяльнае значэнне навуковага прагназавання.

**Тэма 1. Перадгісторыя навукі. Міфалагічныя, даксаграфічныя, рэцэптурныя веды Старажытнага свету і Сярэднявечча**

Характар ведаў і ўменняў першабытнага чалавека і грамадства. Міфалагічныя веды і міфалагічная свядомасць. Эмпірычныя веды першабытнага чалавека і іх рэцэптурны характар.

Неалітычная рэвалюцыя і яе сутнасць. Дэмаграфічныя і сацыяльныя наступствы неалітычнай рэвалюцыі. Штодзеннае жыццё чалавека (умовы і працягласць жыцця, медыцынскія веды, формы перадачы эмпірычнага вопыту). Пачатак апрацоўкі металаў і яе асаблівасці ў розных рэгіёнах. Новыя тэхнічныя ўменні, падзел працы, сацыяльная дыферэнцыяцыя грамадства. Першыя цывілізацыі старажытнасці.

Узнікненне першых цывілізацый. Крытэрыі цывілізацыі. Спецыфіка старажытнаўсходніх цывілізацый. Характар ведаў на Старажытным Усходзе, перадача і накапленне інфармацыі. Элітарнасць і сакральнасць ведаў.

Сістэмы пісьма. Піктаграмы і ідэаграмы. Клінапіснае і іерагліфічнае пісьмо. Тэхніка пісьма і матэрыялы для яго. Стварэнне алфавіта. Астраномія і лічэнне часу. Месяцавы каляндар, падзел і працягласць года і сутак. Сонечны і вадзяны гадзіннікі. Матэматычныя веды вавіланян, егіпцян, індусаў. Медыцынскія веды грамадстваў Старажытнага Усходу. Дасягненні егіпецкай, кітайскай, індыйскай медыцыны. Хімічныя рэчывы і іх выкарыстанне.

Спецыфіка адносін да ведаў і інтэлектуальнай дзейнасці ў антычных грамадствах. Філасофскія веды і тэхнічныя веды. Сістэма бачання свету ў антычных грамадствах. Прынцыпы, задачы і правілы стварэння гістарычных прац. Матэрыялы для пісьма. Папірусныя і пергаментныя кнігі, тэхналогія іх вырабу і захавання. Першыя зборы кніг. Александрыйская бібліятэка. Тэхнічныя дасягненні антычнасці і медыцынскія веды антычнага грамадства.

Карціна свету і філасофскія асновы інтэлектуальнай дзейнасці ў Сярэднявеччы. Фіксацыя ведаў і захоўванне інфармацыі. Сістэма навучання. Манастыры як асяродкі пісьменнасці і тэхнічных ведаў. Царкоўныя і свецкія

школы. Еўрапейскія універсітэты. “Трывіум” і “квадрывіум”. Схаластыка. Астраномія, алхімія і іх мэты.

Навукова-тэхнічныя веды арабскага Усходу. Адносіны да навук а Арабскім халіфаце. “Дом мудрасці”. Матэматыка, з’яўленне алгебры, “арабскія” лічбы. Астраномія, з’яўленне першых абсерваторый, геаграфія, мараходства. Арабская тэрміналогія ў розных галінах ведаў. Медыцына і яе арганізацыя на арабскім Усходзе, гігіена, працы ар-Разі і Авіцэнны.

**Тэма 4 Метад, метадалогія і спецыфіка класічнай навукі**

Сацыяльныя, эканамічныя і культурная перадумовы развіцця навукі ранняга Новага часу. Адносіны да антычнай спадчыны і яе актуалізацыя. Статус інтэлектуальнай працы і яе сацыяльнае значэнне. Змены адносінаў да мастацтва. Неаплатанізм як філасофская аснова метадалогіі класічнай навукі. Рацыяналізм. Н’ютанаўская карціна свету і механіцызм.

Значэнне Вялікіх геаграфічных адкрыццяў, кнігадрукавання, з’яўлення акуляраў для актывізацыі навуковых заняткаў. Тэхнічныя вынаходніцтвы ў мараплаванні, з’яўленне агнястрэльнай зброі. Набыццё Заходняй Еўропай статуса сусветнага лідэра. Універсальнасць ведаў вучоных эпохі Адраджэння. Леанарда да Вінчы, Мікалай Капернік.

Уплыў на развіццё класічнай навукі антычнай і сярэднявечнай традыцыі. Інстытуалізацыя навукі і з’яўленне першых навукова-даследчых устаноў. Механістычная карціна свету і прыярытэтныя навуковыя галіны. Уплыў на навуку і адукацыю пачатка кнігадрукавання.

Сутнасць і змест навуковай рэвалюцыі XVI–XVII ст. Метадалогія і метады пазнання ў працах Ф. Бэкана, Г. Галілея, Р. Дэкарта. Астраномія, матэматыка, фізіка. Дзейнасць М. Каперніка, Г. Галілея, Ц. Браге, І. Кеплера, Дж. Бруна. Развіццё фізічных ведаў у працах Э. Тарычэлі, Б. Паскаля, О. фон Герыке, Р. Бойля, Э. Марыёта і г.д. К Семяновіч і “Вялікае мастацтва артылерыі”. Навуковыя веды і тэхнічныя прыстасаванні ў галіне оптыкі. Ф.

Грымальдзі, О. Рэмер, Х. Гюйгенс, Р. Гук і г.д. З’яўленне хвалевай тэорыі святла. Удасканаленне тэлескопа і з’яўленне мікраскопа.

Хімія, біялогія і медыцына у еўрапейскай класічнай навуцы. Спецыфіка развіцця дадзеных навуковых накірункаў. Алхімія і натрахімія. Погляды і дзейнасць Парацэльса. развіццё хімічных ведаў і з’яўленне новых хімічных тэрмінаў. Вытворчасць хімічных рэчываў і пачатак “эры крышталя”. Тэорыя флагістона. І. Б. ван Гельмонт, Р. Бойль, Р. Глаубер. Анатомія і медыцына. А. Везалій, У. Гарвей, Р. Дэкарт як натураліст.

### Тэма 6. Навуковыя і сацыякультурныя дэтэрмінанты неакласічнай навукі

Філасофскія асновы светапогляду і навуковых ведаў эпохі Асветы. Пачатак дысцыплінарнага падзелу навук. Энцыклапедызм і энцыклапедысты ў Францыі. Грамадскі і сацыяльны ідэал вучоных эпохі. Дэмакратызацыя і новыя падыходы ў педагогіцы. Пачатак навуковай рэфлексіі гістарычных ведаў, з’яўленне дэтэрміністцкіх падыходаў у гістарычным пазнанні.

Матэматыка і фізіка (Г. В. Лейбніц, Л. Эйлер, Ж.Б. Даламбер, К.Ф. Гаус, Ж.Б. Фур’е і інш.). Даследаванні тэмператур і стварэнне тэмпературных шкал (Г.Д. Фарэнгейт, Р.Ф. дэ Рэамюр, А. Цэльсій, У. Томсан і г.д.). З’яўленне тэрмадынамікі (Г.В. Рыхман, Дж. Блэк, і. Вільке, Л. Лавуаз’е і інш.). разнастайнасць навуковай дзейнасці М.В. Ламаносава.. М. Пачобут-Адляніцкі і накірункі яго дзейнасці. Ж.-Б. Ламарк, Ж.-Л. Леклерк де Бюфон, К. Ліней і іх дзейнасць у галіне прыродазнаўства. Разнастайнасць навуковай дзейнасці М.В. Ламаносава.. М. Пачобут-Адляніцкі і накірункі яго дзейнасці. Ж.-Б. Ламарк, Ж.-Л. Леклерк де Бюфон, К. Ліней і іх дзейнасць у галіне прыродазнаўства. Стварэнне першага кандэнсатара. Б. Франклін і вынаходніцтва громаадвода. Ш. Кулон, Л. Гальвані, А. Вольта і г.д.

## Тэма 8. Некласічная навука і прамысловая рэвалюцыя другой паловы XIX – першай паловы XX ст.

Навуковыя асновы пазнання. пазітывізм як метадалагічная парадыгма XIX ст. Распрацоўка пазітывісцкай метадалогіі ў гуманітарным пазнанні. Геаграфічны, псіхалагічны, эканамічны, сацыяльны дэтэрмінізм і шматфактарнасць у пазітывісцкай метадалогіі. Прыярытэт гістарычнай крыніцы і разгортванне археалагічных даследаванняў, краязнаўства, археаграфіі і г.д. Актывізацыя і рост навуковай перыёдыкі, дзейнасць навуковых таварыстваў і г.д. Якасныя змяненні ў адукацыі.

Рэвалюцыя ў галіна біялогіі і медыцыны. Эвалюцыйная тэорыя Ч. Дарвіна і тэорыя клетачнай будовы арганізмаў. Праблема філагенэза ў прыродазнаўчых навуках, развіццё палеанталогіі і эвалюцыйнай эмбрыялогіі (Э. Гекель,  А. А. Кавалеўскі, І.І. Мечнікаў, У.А. Кавалеўскі, А.М. северцаў і інш.) І.М. Сечанаў і І.П. Паўлаў і іх вучэнне аб вышэйшай нервовай дзейнасці. Асептыка і антысептыка, з'яўленне пастэрызацыі. Распраўсюджванне медыцынскага абслугоўвання, норм гігіены, ўпарадкаванне гарадскога асяроддзя. Новы медыцынскі інструментарый і сродкі дэзінфекцыі. Павышэнне працягласці жыцця ў еўрапейскіх краінах.

Матэматызацыя прыродазнаўчых навук. Электрадынаміка ў ўкараненне тэхнічных вынаходніцтваў у вытворчасць. Электрычнасць і магнетызм. Стварэнне электрычнага рухавіка. Дзейнасць Х. Эрстэда, А.М. Ампера, Г.С. Ома, М. Фарадэй, Дж. Максвэл, Г.Р. Герц і інш.). Карпускулярная і хвалевая тэорыі святла (Т. Юнг, А. Фрэнэль і г.д.). Развіццё неарганічнай хіміі. Перыядычная табліца элементаў Д.І. Мендэлеева. Тэорыя груп і крысталаграфія.

Змяненні ў паўсядзенным жыцці. З'яўленне парахода, паравоза, чыгункі, трамвая, дыліжанса, веласіпеда, аўтамабіля. Павышэнне камфортнасці жылля, удасканальванне сродкаў сувязі (тэлеграф, тэлеграфны апарат, тэлефон, радыё і г.д.). Гуказапіс, фатаграфія і кінематограф.

Рэвалюцыя ў галіна біялогіі і медыцыны. Эвалюцыйная тэорыя Ч. Дарвіна і тэорыя клетачнай будовы арганізмаў. Праблема філагенэза ў прыродазнаўчых навуках, развіццё палеанталогіі і эвалюцыйнай эмбрыялогіі. Пашырэнне медыцынскага абслугоўвання, распрацоўка норм гігіены, ўпарадкаванне гарадскога асяроддзя.

Змены ў філасофскай карціне свету ў пачатку ХХ ст. Крызіс пазітывізма. Неаканціянства, герменеўтыка, інтуітывізм, фенаменалогія ў навуковым пазнанні. Рэлятывізм у навуцы. Ператварэнні ў гуманітарных ведах, сацыяльная гісторыя і стварэнне “Школы “Аналаў””. Роля марксісцкай навуковай парадыгмы ў навуцы. Гістарычныя і прыродазнаўчыя навукі СССР.

Змяненне да статусу ведаў і ролі даследчыка ў навуцы. З’яўленне квантавай фізікі. Стварэнне мадэлі атама, адкрыццё радыёактыўнасці, тэорыя адноснасці А. Эйнштэйна, працы К. Цыялкоўскага і г.д. Рэвалюцыя ў медыцыне, з’яўленне псіхааналіза. Распрацоўкі ў ваеннай галіне. Першая сусветная вайна і яе новае тэхналагічнае аблічча. Другая сусветная вайна і яе тэхнічнае забеспячэнне. Стварэнне ядзернай зброі.

## Тэма 9. Постнекласічная навука і сучаснае інфармацыйнае грамадства

Постнекласічная навука і яе рысы. Інфармацыйнае (постіндустрыяльнае) грамадства як актуальный этап развіцця чалавецтва.

Вызначэнне і сутнасць НТР (навукова-тэхнічнай рэвалюцыі). Этапы НТР і іх асаблівасці. Засваенне касмічнай прасторы. Змяненне галіновай структуры вытворчасці і фарміраванне постіндустрыяльнага грамадства. Развіццё сродкаў інфармацыі і камунікацыі, эфект “сціскання свету”. Сацыяльныя наступствы навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. Пабудова тэхнагеннага грамадства і змяненне светапогляду і адчування ў ім чалавека. Павялічэнне расходаў на вышэйшую адукацыю ў развітых краіных і скачкападобнае ўзрастанне колькасці студэнтаў і асоб з вышэйшай адукацыяй. “Бунт моладзі” і маладзежная субкультура.

Ператварэнне навукі ў непасрэдную вытворчую сілу і паскарэнне ўкаранення навуковых распрацовак у вытворчасць. Міжнароднае навуковае супрацоўніцтва ў сучасным свеце. Інтэграцыя і каапературыя ў навуковай сферы. Змяненні ў сістэме адукацыі пад уплывам інфарматызацыі грамадства. Інтэрнацыяналізацыя адукацыі, стварэнне агульнай адукацыйнай прасторы.

Якасныя змяненні ў штодзенным жыцці і ўмовах існавання чалавека. Пабудова тэхнагеннага грамадства і змяненне светапогляду і адчування ў ім чалавека. Сучасная бытавая тэхніка, магчымасці Інтэрнэта і мабільнай сувязі і ўплыў дадзеных фактараў на лад жыцця.

Сітуацыя постмадэрна ў навуковым пазнанні. Постмадэрн у гістарычнай навуцы, змяненне і новы стутус крыніцы як універсальнага артэфакта культуры. Тэкст і дыскурс у гістарычнай навуцы. Антрапалагічны і лінгвістычны павароты ў гістарычнай навуцы. Плюралістычнасць сучаснай метадалогіі гістарычнага даследавання.

## ІНШЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ (НАВУКОВАЯ ЛІТАРАТУРА


1. *Боголюбов, А.Н.* Механика в истории человечества / А.Н. Боголюбов. – М. : Наука, 1978. – 152 с.
2. *Бродель, Ф.* Материальная цивилизация, экономика и капитализм XV-XVIII вв. В 3 кн. / Фернан Бродель; Ред. И.В. Рудницкая. – М.: ООО «Самарский дом печати», 2006–2007.
3. *Бродель, Ф.* Грамматика цивилизаций / Ф. Бродель. – М. : Весь мир, 2008. – 552 с.
4. *Вернадский, В.И.* Труды по всеобщей истории науки / В.И. Вернадский. – 2-е изд. – М. : Наука, 1988. – 336 с.
5. *Григорьян, А.Т.,* Рожанская, А.М. Механика и астрономия на средневековом Востоке / А.Т. Григорьян, А.М. Рожанская. – М.; Наука, 1980. – 200 с.
6. *Греков, Б. Д.* Киевская Русь: Электронный ресурс. Режим доступа: https://www.litmir.me/br/?b=123408&p=1
7. *Дэвис, Н.* История Европы / Н. Дэвис. – М.; АСТ, Транзиткнига, 2004. – 943 с.
8. *Ігнатоўскі, У.М.* Кароткі нарыс гісторыі Беларусі /У.М. Ігнатоўскі; Уступ. арт. А.П. Грыцкевіча; камент. і заўвагі Э.П. Гнеўкі. – 5-е выд.– 5-е выд. – Мн.: Беларусь, 1991. – 190 с.
9. *Ключевский, В. О.* Боярская дума Древней Руси / В. О. Ключевскай. – любое издание либо электронный ресурс, напр. : https://www.google.com/search?q=ключевский+боярская+дума+древней+руси&oq=ключевский+боярская+дума+древней+руси&aqs=chrome..69i57.18195j0j4&client=ms-android-xiaomi-rev1&sourceid=chrome-mobile&ie=UTF-8
10. *Ле Гофф, Ж.,* Трюон, Н. История тела в средние века. – Жак Ле Гофф, Николя Трюон, пер. с фр. – М.; Текст, 2008. – 189 с.

11. *Плутарх.* Избранные жизнеописания. В двух томах / Плутарх / Пер. с древнегр. Сост., вступ. ст., прим. М. Томашевской. – М.: Правда, 1986.
12. *Русская правда :* Электронный ресурс: Режим доступа: http://drevne-rus-lit.niv.ru/drevne-rus-lit/text/russkaya-pravda-prostrannaya/russkaya-pravda-prostrannaya.htm
13. *Салическая правда :* Электронный ресурс – Режим доступа: https://www.hist.msu.ru/ER/Etext/salic.htm
14. *Светоний, Г. Т.* Жизнь двенадцати цезарей / Гай Светоний Транквилл. – Пер. с лат. М.Л. Гаспарова; Послесл. М.Л. Гаспарова, Е.М. Штаерман. – М.: Правда, 1988. – 512 с.
15. *Стрыйковский, М.* Хроника Польская, Литовская, Жмудская и всей Руси - Электронный ресурс: Режим доступа: https://archive.org/details/20201116_20201116_2035
16. *Сидорцов, В.Н.* Методология исторического исследования: Механизм творчества историка / В.Н. Сидорцов – Мн.: БГУ, 2000. – 231 с.
17. *Хроника* Быховца: [Предисл., коммент. И пер. Н.Н. Улащика. Отв. ред. М.Н. Тихомиров]. – М.: Наука, 1966. – 154 с.
18. *Шейпак, А.А.* История науки и техники. Материалы и технологии / А.А. Шейпак. – В 2 ч. – М.; МГИУ, 2009.

## 2. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ
## МАТЭРЫЯЛЫ ДЛЯ ПРАВЯДЗЕНЯ СЕМІНАРАЎ І ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ

### ПРАКТЫЧНЫ ЗАНЯТАК 1. Тэма 2. Адлюстраванне гістарычнага працэсу ў творах антычных аўтараў (кампаратыўны аналіз твораў Плутарха і Светонія)

*Кампаратыўны аналіз і чытанне адпаведных тэкстаў(літаратура прыведзена вышэй) павінны раскрыць кола наступных пытаняў:*

Гістарычныя ўмовы стварэння прац Плутарха і Светонія. Метадалогія твораў, падыходы і прынцыпы напісання біяграфій. Аўтарскія пазіцыі Плутарха і Светонія. Плутарх (каля 46-126 г. н.э.) як класік біяграфічнага жанру. Задачы "Параўнальных жыццяпісаў" і час іх стварэння. Падбор Плутархам персаналій для апісання. Светоній (каля 70-каля 140 г. н.э. ) як майстар біяграфічнага жанру ў старажытнарымскай гістарыяграфіі. Час стварэння, мэта і змест"Жыцця дванаццаці цэзараў". Суадносіны гістарычных дзеячаў і іх сацыяльнага асяроддзя.

Логіка і сэнс параўнання, ступень псіхалагізма ў характарыстыцы дзеячаў антычнасці. Суадносіны біяграфій і апісваемых гістарычных падзей. Значэнне твора Плутарха для гістарычнай навукі. Псіхалагічныя характарыстыкі і псіхалагічная дынаміка апісваемых асоб. Гістарычныя падзеі, быт і норавы ў кантэксце "Жыцця дванацаці цэзараў". Гістарычнае значэнне працы Светонія.

### ПРАКТЫЧНЫ ЗАНЯТАК 2. Тэма 3. Заходняя Еўропа і славянскі свет у адлюстраванні сярэднявечных помнікаў права (кампаратыўны аналіз "Салічаскай праўды" і "Рускай праўды")

*Кампаратыўны аналіз і чытанне адпаведных тэкстаў(літаратура прыведзена вышэй) павінны раскрыць кола наступных пытаняў:*

Месца і час стварэння “Салічаскай праўды” і “Рускай праўды”. Рознасць мадэляў развіцця краін сінтэзнага і бяссінтэзнага варыянтаў феадалізацыі.

Ступень распрацаванасці абстрактных паняццяў, классіфікацыі злачынстваў і пакараняў у “Салічаскай праўдзе” і “Рускай праўдзе”. Сістэматычнасць выкладання артыкулаў, іерархія правапарушэняў.

Кампаратыўны аналіз прававога стану розных катэгорый насельніцтва, прававых прыярытэтаў, ступені распрацаванасці розных галін права.

“Салічаская праўда” і “Руская праўда” як гістарычныя крыніцы.

## ПРАКТЫЧНЫ ЗАНЯТАК 3. Тэма 5. Развіццё гістарычных ведаў у ранні Новы час (на прыкладзе “Хронікі…” М. Стрыйкоўскага і “Хронікі Быхаўца”

*Кампаратыўны аналіз і чытанне адпаведных тэкстаў(літаратура прыведзена вышэй) павінны раскрыць кола наступных пытаняў:*

Умовы стварэння, захавання, публікацыі, навуковай рэфлексіі “Хронікі…” Стрыйкоўскага і “Хронікі Быхаўца”. Ступень апоры на крыніцы, аналітычнасці, дакладнасці выкладаня матэрыялу. Спецыфіка аўтарскага дыскурсу “Хронік…”

Асноўныя ідэі твораў. Супастаўленне аўтарскіх стратэгій выкладання матэрыяла, высвятленне аўтарскай пазіцыі. Крытычны аналіз магчымых лакун і недакладнасцяў. Лексіка твораў.

Змест “Хронік…” і гістарычныя падзеі, якія ў іх асвятляюцца. Параўнанне аўтарскіх пазіцый да асвятлення аднолькавых падзей. Значэнне “Хронік…” для гуманітарных ведаў.

**ПРАКТЫЧНЫ ЗАНЯТАК 4. Тэма 7. Змест, метадалогія і пабудова гістарычных прац у XIX ст. (параўнаўчы аналіз прац В. Ключэўскага і І. Лапо)**

*Кампаратыўны аналіз і чытанне адпаведных тэкстаў(літаратура прыведзена вышэй) павінны раскрыць кола наступных пытаняў:*

Развіццё расійскай гістарычнай навукі і яе тэарэтычная аснова. Пазітывізм як метадалагічная аснова расійскай гістарыяграфіі другой паловы XIX ст. Дзяржаўная школа. Заходнерусізм. Працы Ключэўскага і Лапо як яскравыя прыклады навуковай парадыгмы эпохі. Фарміраванне філасофскіх і гістарычных поглядаў В.В. Ключэўскага і І. І. Лапо.

Змест і структура "Баярскай Думы старажытнай Русі". Гістарычны дэтэрмінізм паводле Ключэўскага. Вывучэнне дзяржаўных інстытутаў як метадалагічны прыярытэт. Дынаміка сацыяльна-палітычнага развіцця развіцця паводле Ключэўскага. Эвалюцыя дзяржаўных інстытутаў і ўлады ў Расіі.

Праца "Люблінская унія 1569 г." як адлюстраванне метадалагічных і ідэйных пераваг эпохі. Аўтарская пазіцыя і сродкі яе выражэння. Уступны гістарычны аналіз Лапо яго змест. Значэнне прац Лапо для беларускай гімстарыяграфіі.

**ПРАКТЫЧНЫ ЗАНЯТАК 5. Тэма 10. Беларуская гістарычная думка першай паловы XX ст. (параўнаўчы аналіз твораў У. Ігнатоўскага і У Пічэты)**

*Кампаратыўны аналіз і чытанне адпаведных тэкстаў(літаратура прыведзена вышэй) павінны раскрыць кола наступных пытаняў:*

Гістарычны кантэкст стварэння прац. У. Ігнатоўскага і У. Пічэты. Лес гісторыкаў ў кантэксце падзей сацыяльна-палітычнага развіцця міжваеннага часу.

Марксісцкая метадалогія, яе змест, мадыфікацыі і ўплыў на савецкую гістарычную навуку і навуковае супольніцтва. Рысы марксісцкай метадалогіі ў працах Ігнатоўскага і Пічэты.

Пабудова твораў, логіка выкладання, лексіка, аўтарская пазіцыя.

Перыядызацыя гісторыі Беларусі, ключавыя падзеі айчыннай гісторыі, накіраванасць гістарычнага працэсу ў "Кароткім нарысе гісторыі Беларусі2 і "Гісторыі беларускага народа".

## ПРАКТЫЧНЫ ЗАНЯТАК 6. Тэма 11. Метадалагічныя акцэнты гістарычнай навукі сярэдзіны XX ст. (кампаратыўны аналіз прац Ф. Брадэля і Б. Грэкава)

*Кампаратыўны аналіз і чытанне адпаведных тэкстаў(літаратура прыведзена вышэй) павінны раскрыць кола наступных пытаняў:*

Гістарычны кантэкст стварэння "Матэрыяльнай цывілізацыі…" Ф. Брадэля (для разбору прапануецца том першы; як альтэрнатыва ці дадатак – "Граматыка цывілізацый" і "Кіеўскай Русі" Б. Д. Грэкава. Разнастайнасць шляхоў развіцця гістарычнай навукі Захаду і Савецкага Саюза.

Школа "Аналаў": узнікненне, змест канцэпцыі, праблемнае поле даследаванняў, навуковая навізна, новыя ідэі, прадстаўнікі. Ф. Брадэль як выбітны прадстаўнік другога пакалення "Аналаў". Увасабленне канцэпцыі і прадметнага поля "Аналаў" у працах Ф. Брадэля. Струцкі марксізм 1ктуры паўсядзеннасці, гісторыя ментальнасці, розныя хуткасці гістарычнага часу і г.д.

Савецкі марксізм пасляваенных дзесяцігоддзяў. Абумоўленасць метадалогіі гістарычных прац савецкіх гісторыкаў ідэалагічнымі прыярытэтамі СССР. Увасабленне ідэалагічных канонаў савецкага марксізма ў "Кіеўскай Русі" Б. Д. Грэкава. Пабудова твора і іерархія разглядаемых праблем. Дамінаванне разгляду сацыяльна-эканамічных прцэсаў і класавай барацьбы. Канцэпцыя гісторыі Старажытнай Русі і значэнне назвы "Кіеўская

Русь.” Значэнне працы Грэкава для далейшага развіцця савецкай гістарыяграфіі.

## ПРАКТЫЧНЫ ЗАНЯТАК 7. Тэма 12. Разнастайнасць падыходаў у гуманітарных даследаваннях у постсавецкі час (параўнаўчы аналіз твораў Ж. ле Гофа і М. Ермаловіча)

*Кампаратыўны аналіз і чытанне адпаведных тэкстаў(літаратура прыведзена вышэй) павінны раскрыць кола наступных пытаняў:*

Сацыяльна-палітычныя змены канца XX ст. і іх уплыў на постсавецкую гістарыяграфію. Крушэнне марксісцкай парадыгмы. Станаўленне нацыянальных гістарыяграфій рэспублік былога СССР. Працы “Па слядах аднаго міфа” і “Беларуская дзяржава Вялікае княства Літоўскае” як знакавыя падзеі беларускай гістарыяграфіі. Сацыякультурны і сацыяльна-палітычны кантаэкст і абставіны стварэння прац М. Ермаловіча. Канцэпцыя узнікнення і характару ВКЛ М. Ермаловіча і яе прынцыповае адрозненне ад традыцыйнай канцэпцыі.

Месца школы “Аналаў” у еўрапейскай гістарыяграфіі. Ж. ле Гоф і кола яго даследаванняў. Ментальнасць, структуры паўсядзеннасці і асаблівасці перыядызацыі Сярэднявечча ў канцэпцыі Ле Гофа. “Гісторыя цела ў сярэднія вякі” як адна з паказальных прац накірунку “Аналаў”. Аўтарская аргументацыя, абгрунтаванне кола даследаваняў, метадалогія, эўрыстычная каштоўнасць тэкста.

Паказальнасць прац ле Гофа і Ермаловіча для ўсведамлення рознасці, разнастайнасці і спецыфікі як умоў развіцця гістарычнай навукі, так і праяўлення ў ёй розных метадалагічных падыходаў. Значэнне прац Ж. Ле Гофа і М. Ермаловіча для сучаснай гістарычнай навукі.

## СЕМІНАР

### Тэма 13. Сучасныя навуковыя распрацоўкі і прагнозы будучага

*Спецыфіка разглядаемай тэмы, фармат курса па выбару, а таксама інфармацыйная насычанасць прадугледжваюць вольны выбар студэнтамі пытанняў да абмеркавання. Кола абмяркоўваемых пытанняў наступнае:*

Асноўныя накірункі сучасных навуковых распрацовак: альтэрнатыўныя крыніцы энергіі, стварэнне штучнага інтэлекта, генная інжэнерыя, прадаўжэнне чалавечага жыцця і перамога над працэсамі старэння, поўная замена ўсіх органаў чалавека і штучнае іх стварэнне, пашырэнне кіберпрасторы і стварэнне сістэмы “чалавек-камп’ютар”, паступовае засяленне чалавекам іншых планет Сонечнай сістэмы і інш. Актуальныя распрацоўкі ў ваенай галіне і сучаснае аблічча вайны. Гібрыдныя войны.

Прычыны нарастання глабальных праблем сучаснасці. Сутнасць глабальных праблем і іх віды. Магчымыя шляхі вырашэння глабальных праблем сучаснасці. Маральна-этычныя і прававыя праблемы прымянення навуковых распрацовак з умяшальніцтвам у прыроду чалавека. Рызыкі і небяспекі існавання чалавека ў інфармацыйным грамадстве. Сутнасць і праявы цывілізацыйнага крызіса. Фактары пагрозы існавання чалавека. Трансгуманізм і постчалавек. “Футурашок”. Сцэнарыі будучага развіцця чалавецтва.

## 4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

**Пытанні для заліку па курсу па выбару «Гісторыя і метадалогія навуковых ведаў»**

1. Уводзіны. Тэарэтычныя асновы і паняцці курса.
2. Спецыфіка навуковага засваення чалавекам свету.
3. Каштоўнасныя і этычныя асновы навуковай дзейнасці.
4. Метададалогія, метад, метадалагічная парадыгма.
5. Станаўленне чалавека, яго эмпірычныя веды і міфалагічная свядомасць.
6. Эмпірычныя, даксаграфічныя, рэцэптурныя веды.
7. Фіксацыя інфармацыі і яе роля ў развіцці чалавецтва. Сістэмы пісьменнасці Старажытнага Усходу.
8. Сістэмы пісьменнасці і захоўвання інфармацыі ў грамадствах антычнасці.
9. Філасофскія веды і пазнавальная парадыгма антычнасці.
10. Філасофская карціна свету у Сярэднявеччы. Схаластыка як метадалогія навучання і пазнання.
11. Сістэма адукацыі сярэднявечнай Еўропы.
12. Навуковыя веды і тэхналогіі Усходу ў перыяд Сярэднявечча.
13. Змяненне карціны свету і станаўленне класічнай навукі ў ранні Новы час.
14. Навуковыя дасягненні еўрапейскай класічнай навукі (XVI-XVII ст.).
15. Метадалогія еўрапейскай навукі ў эпоху Асветы і пачатка прамысловага перавароту.
16. Дасягненні эпохі Асветы ў галіне матэматычных і прыродазнаўчых навук.
17. Развіцце навуковых ведаў на беларускіх землях Расійскай імперыі.
18. Навукова-тэхнічнае развіцце Еўропы і ЗША ў другой палове XIX-першай палове XX ст.
19. Спецыфіка метадалогіі гуманітарнага пазнання ў XIX ст. Пазітывізм у гістарычнай навуцы.

20. Марксісцкая парадыгма навуковага пазнання. Навука СССР і БССР.
21. Змяненні ў навуковай карціне свету ў першай палове XX ст. Рэлятывізм у навуцы.
22. Навуковыя дасягненні некласічнай навукі.
23. Навукова-тэхнічная рэвалюцыя другой паловы XX-пачатку XXI ст. Тэхнагеннае грамадства.
24. Спецыфіка гуманітарнага пазнання эпохі постмадэрна.
25. Разнастайнасць накірункаў і даследчыцкіх стратэгій сучаснай гістарычнай навукі.
26. Навука СССР, БССР і постсавецкай прасторы ў другой палове XX-пачатку XXI ст.
27. Чалавецтва ва ўмовах глабалізацыі і постіндустрыяльнага грамадства.
28. Глабальныя праблемы сучаснасці і магчымыя шляхі іх вырашэння.

Выкладчык, прафесар Л.У. Ландзіна.